# *Змест*

*1. ГІСТОРЫЯ КВАСОЎСКАЙ СШ (1925-2001 гг.)……………………………………………………………2*

*2. ГІСТОРЫЯ КВАСОЎСКАЙ СШ (2002-2023 гг.)………………………………………………………...12*

*3. КВАСОЎСКАЯ СШ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1941-1945 гг……………………………15*

*4. ГІСТОРЫЯ БУДЫНКА КВАСОЎСКАЙ СШ…………………………………………………………….16*

*5. КІРАЎНІКІ КВАСОЎСКАЙ СШ (ДЫРЭКТАРЫ ШКОЛЫ) З 1925 г. І ПА НАШЫ ДНІ………………...19*

*6. НАСТАЎНІКІ КВАСОЎСКАЙ СШ, АДЗНАЧАНЫЯ ВЫСОКІМІ ЎЗНАГАРОДАМІ……………………20*

*7. СЯМЕЙНЫЯ ДЫНАСТЫІ КВАСОЎСКАЙ СШ…………………………………………………………...21*

*8. СЯМЕЙНЫЯ ПАРЫ КВАСОЎСКАЙ СШ……………………………………………………………………23*

*9. ВЫПУСКНІКІ КВАСОЎСКАЙ СШ, ЯКІМІ МЫ МОЖАМ ГАНАРЫЦЦА …………………………….28*

## 1. ГІСТОРЫЯ КВАСОЎСКАЙ СШ (1925-2000 гг.)

*На пачатку XX стагоддзя ў вёсцы Квасоўка школы не існавала, дзяцей вучылі чытанню і пісьму дома. Не дзіва, што большасць людзей у вёсцы ў той час была малапісьменнай і малаграматнай. У Квасоўцы граматнымі былі толькі Шкута (Войт), Бык Сцяпан, Дзюрдзь Іосіф. Такое становішча было і ў суседніх з Квасоўкай вёсках.*

*Той, хто хацеў вучыцца і меў для гэтага матэрыяльныя магчымасці, павінен быў ездзіць у Індурскую школу, дзе працавала сямігодка.*



***(Чатырохгадовая школа, чатыры настаўнікі ў цэнтры)***

*Першая школа ў Квасоўцы была пабудавана толькі ў 1925 годзе і прадстаўляла сабой драўляны будынак. У ім і была адкрыта пачатковая школа з польскай мовай навучання.*

*Першым дырэктарам школы была* ***Бабіцкая Алена****.*
*У школе навучалася* ***32*** *вучні.*

*У наступныя гады была адкрыта чатырохгадовая школа, у якой працавала ўжо чатыры настаўнікі.*

*У 1931 годзе быў адкрыты 5-ы клас і хуткім часам пачала развівацца сямігодка. У ёй навучалася ўжо* **85** *чалавек. Дырэктарам школы працаваў* ***Фанкоўскі Франц.***

*У 1934 годзе адбыўся першы выпуск 7-га класа. Сярод выпускнікоў быў і* ***Жывалеўскі Рыгор Аляксандравіч****, які пазней стаў настаўнікам Квасоўскай школы.*



***Жывалеўскі Рыгор Аляксандравіч***




*Праз некалькі гадоў дырэктарам школы быў прызначаны* ***Фарад Мечыслаў****, якога вельмі любілі і паважалі вучні, бацькі і настаўнікі. )*

*Памёр Фарад Мечыслаў у 1937 годзе вельмі маладым (31 год) і пахаваны на могілках в. Квасоўка. Яго сын, які пражываў у Польшчы, прыязджаў у Квасоўку наведаць магілу бацькі.*

*У 1938 годзе драўляны будынак школы згарэў. Для будаўніцтва новай школы пачалі збіраць сродкі жыхары Квасоўкі, чые дзеці вучыліся ў школе. Гэты будынак і сёння прымае ў сваіх цёплых і ўтульных памяшканнях дзяцей з Квасоўкі і навакольных вёсак.*

***(Магіла ў аг. Квасоўка, дзе пахаваны Фарад Мечыслаў)***



*Да 1939 года школа ў Квасоўцы была польская. Пасля яе заканчэння дзеці заставаліся ў асноўным на гаспадарцы, дапамагаць бацькам. Толькі 2 вучні змаглі паступіць у настаўніцкую семінарыю – гэта* **Сак І.** *і* ***Шкута М.*** *Але і яны пасля заканчэння семінарыі не змаглі атрымаць работу па спецыяльнасці. У 1939 годзе ў Квасоўцы і навакольных вёсках не было ні аднаго чалавека з вышэйшай адукацыяй.*

*Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР у 1939 годзе ў вёсцы адкрываецца беларуская сямігадовая школа. Першым яе дырэктарам быў* ***Кішкель І.Ф.*** *У школе вучыліся дзеці з усіх навакольных вёсак.*

*У 1941 годзе вёска падверглася бамбардзіроўцы і 2 бомбы папалі ў школьны будынак. Чатыры гады дзеці нідзе не вучыліся.*



*У 1946 годзе ў весцы Лікоўка (1 км ад Квасоўкі) адкрываецца пачатковая школа, у якой налічвалася* **65** *чалавек. Тут і пачаў працаваць* ***Жывалеўскі Р.А.***, *які да гэтага скончыў 7 класаў польскай школы і самастойна вывучыў беларускую мову. У 1947 годзе школа з вескі Лікоўка пераводзіцца ў Квасоўку ў адрамантаваны будынак, які быў разбураны ў гады ВАВ. У 1948 годзе быў адкрыты 5 клас, у якім налічвалася* **35** *вучняў. У 1951 годзе адбыўся першы выпуск Квасоўскай сямігодкі.*

***Жывалеўскі Р.А. з дзецьмі***

*Дырэктарам школы ў гэты час была **Марыя Смірнова**. Вывучэнне кнігі загадаў таго часу паказала, што дырэктар шмат увагі надавала ўмацаванню парадку і дысцыпліны, пытанням працоўнага і патрыятычнага выхавання.*



*Сярод **32** выпускнікоў быў Біркас Аляксандр Адамавіч, кандыдат медыцынскіх навук, прафесар, які пазней стаў выкладчыкам Гродзенскага медыцынскага інстытута.*



***Біркас Аляксандр Адамавіч***

*У 1952 годзе школа ператвараецца ў сярэднюю. У 8 клас было набрана **56** вучняў з навакольных вёсак: Лікоўка, Каўпакі, Гарны, Віцькі, Дзекалавічы, Дарошавічы, Свіслач, Няцечы, Сухая Даліна, Хамякі, Шчарбовічы, Каленікі, Літвінкі, Лаша, Кавалічы, Баранава, Балічы, Глядавічы, Карозічы, Ферма, Сцяцкі.*

*У 1955 годзе адбыўся першы выпуск Квасоўскай сярэдняй школы. **56** юнакоў і дзяўчат атрымалі атэстаты аб сярэдняй адукацыі. Два чалавекі атрымалі залатыя медалі: **Цонда Р. і Барысевіч С.***

*У 50-я гады ў школу прыязджаюць працаваць усё новыя і новыя настаўнікі: Кальцоў Уладзімір Максімавіч (у 1953г.), маладая пара Мельнікавых – Кацярына Ігнацьеўна і Міхаіл Герасімавіч, Вера Тарасаўна Логвінцава (у 1954г.), Данчанка Галіна Аляксандраўна, Іосько Марыя Канстанцінаўна, Заркевіч Дзмітрый Макаравіч.*












*Цераз год прыехала працаваць у школу Ярашэвіч Лідзія Ільінічна, а яшчэ цераз год – сям'я Нікіціных: Ніна Міронаўна і Яўгеній Мікалаевіч.*








*У 1957 годзе дырэктарам школы быў прызначаны* ***Маскоўскіх Пётр Сяргеевіч****.*

*Школа працавала ў дзве змены. Другая змена займалася з керасінавымі лямпамі. Ідучы ў школу, вучні бралі з сабой "падмацаванне" – кусок хлеба, які з'ядалі на перапынку.*

*Зімой у школе было вельмі холадна, таму сядзелі нават у паліто і валенках. Здаралася, што замярзалі нават чарнілы.*

*У 1958 годзе па ініцыятыве Лідзіі Ільінічны Ярашэвіч, якая працавала настаўнікам гісторыі, быў закладзены невялікі школьны лясок. Кожны клас пасадзіў па аднаму радочку дрэў. На вялікі жаль дрэвы не ўдалося захаваць, таму што пачалося будаўніцтва жылля і фізкультурнага комплексу як раз на тым месцы, дзе раслі гэтыя прыгожыя дрэўцы.*

*У 1962 годзе ў школе не было выпуска, таму што школа перайшла на вытворчае навучанне. Затое ў наступным годзе было два класы выпускнікоў. У гэтым жа годзе ў школе было ўведзена гарачае харчаванне.*

*З цягам часу стала цеснай для шматлікай сельскай дзетвары. Новым дырэктарам школы быў назначаны* ***Вяржбіцкі Франц Ігнацьевіч.***




*Вяржбіцкі Ф.І. падняў пытанне аб пашырэнні школы, аднак будаўніцтва было затрымана з-за немагчымасці заказаць дакументацыю. Жылля для настаўнікаў таксама не было. Некаторыя настаўнікі (Кальцоў В.М., Ярашэвіч Л.І. і інш.) пачалі будаваць свае ўласныя дамы.*

*У 1966/1967 навучальным годзе дырэктарам школы стаў* ***Каротцаў Фёдар Афанасьевіч.***



***Каротцаў Фёдар Афанасьевіч***

*Каротцаў Ф.А. заказаў дакументацыю на прыбудоўку школы, а вучні разам з настаўнікамі падрыхтавалі катлаван пад кацельную і фундамент будынка. З 1968 года пачалося будаўніцтва прыбудовы на 18 класных памяшканняў, якое было скончана ў 1970 годзе ўжо пры новым дырэктары школы* ***Кавальчуку Івану Васільевічу****.*



***Кавальчук Іван Васільевіч***

*У 1969 годзе пачалося будаўніцтва школьнага стадыёна з усімі пляцоўкамі для гульнявых відаў спорту, а таксама бегавыя дарожкі. У тым, што спартыўны комплекс быў адным з лепшых у раёне, заслуга настаўніка фізкультуры* ***Рыкава Міхаіла Яфімавіча****.*

*Аднак школа не мела закрытага памяшкання для заняткаў фізічнай культуры. І вось у канцы 80-х гадоў пачынаецца будаўніцтва калгаснага спартыўнага комплексу, які размяшчаецца побач са школаю. І ў 1994 годзе ўжо можна было праводзіць урокі і спартыўныя мерапрыемствы ў новай прасторнай спартыўнай зале.*

*З канца 60-х гадоў у школе замацаваліся на доўгія гады пастаянныя кадры: Кавальчук І.В., Кавальчук Н.Ф., Скварко К.Б., Эйсмант Р.С., Песцерняк М.Д., крыху пазней – Ціткова М. І.*

*На жаль, у 1976 годзе заўчасна пайшла з жыцця лепшая настаўніца пачатковых класаў Ермалаева І.К.*

*Школа папаўнялася кадрамі і з ліку сваіх былых выпускнікоў: Дзюрдь К.І., Шота Г.З., Гваздоўская Г.С.*

*У 70-я гады пайшлі на заслужаны адпачынак настаўнікі, якія прапрацавалі ў школе па некалькі дзесяткаў гадоў: Гаўрыляк В.М., Шкута І.В., Жывалеўскі Г.А. Не затрымліваліся доўга ў школе педагогі, якія ездзілі на работу з горада, хаця шмат хто з іх меў добрую падрыхтоўку і вопыт работы з дзецьмі. Таксама часта мяняліся старэйшыя піянерважатыя.*

*Трэба адзначыць важкі ўклад у станаўленне калектыву і школьных традыцый Мельнікавай Кацярыны Ігнацьеўны, якая прапрацавала завучам школы да 1985 года (да выхаду на пенсію), Ярашэвіч Лідзіі Ільінічны, якая з 1970 года па 1984 год працавала арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы.*

*Ішлі гады. Мяняліся выпускі, узрастала колькасць выпускнікоў школы. Нарэшце, надышоў дзень 26 чэрвеня 1983 года, калі ва ўрачыстай абстаноўцы быў уручаны атэстат аб сярэдняй адукацыі тысячнаму выпускніку. Ім аказаўся Мажэйка Канстанцін з в. Баранава. А ў 1988 годзе колькасць выпускнікоў склала* **1101** *чалавек.*

*Найбольшая колькасць вучняў была ў 1974 годзе –* ***304*** *чал., найменшая – у 1984 годзе –* **156** *чалавек. Пачынаючы з 1984 года, ёсць усе падставы для роста колькасці вучняў у школе.*

*У 80-я гады працягвала адбывацца змена кадраў: пайшоў на пенсію і памёр ва ўзросце 63 гадоў ветэран, інвалід Вялікай Айчыннай вайны Кальцоў У.М., пайшлі на пенсію Мельнікаў М.Г., Нікіціна Н.М.*

*У 1979 годзе прыйшла ў школу працаваць Чучва Г.І., якая змяніла на пасту завуча Мельнікаву К.І.*

*Пачынаючы з 1981 года, у школе працуе Сарока Г.І. спачатку старэйшай піянерважатай, а затым настаўнікам пачатковых класаў.*

*Крыху пазней у школу прышлі Казакевіч Г.Т. і Калюта Н.Р. (настаўнік рус.мовы і літаратуры), Капля В.М. (настаўнік фіз.культуры), Князеў Б.А. (пачатковая ваенная падрыхтоўка), Лашук А.М. (зам.мова), Бузюк А.У. (гісторыя), Усціновіч Г.В., якая змяніла Шоту Г.З. на пасадзе арганізатара пазакласнай работы. Сталі старажыламі школы Лубоўская Я.А. (бел.мова), Дзюрдзь З.В. (выхавацель, а затым настаўнік пач.класаў). Прышлі ў школу Зарэцкая М.В (бібліятэкар) і Шкута К.А. (пачатковыя класы).*

*У 80-я гады зроблены далейшыя крокі па ўмацаванню матэрыяльнай базы школы: абсталяваны кабінеты, пабудавана цяпліца, прыбудоўка да майстэрні, сістэма ацяплення падключана да калгаснай у 1982 годзе.*

*Сіламі вучняў пад кіраўніцтвам Ярашэвіч Л.І. створаны музей народнага мастацтва і быту, на базе якога вывучаецца культура і быт нашай мясцовасці. Вялікую спадчыну продкаў вучні пазнаюць не толькі на словах, але і на справе: вучацца прасці, ткаць, вышываць.*

*У 1984 годзе Ярашэвіч Л.І., а ў 1985-м – Мельнікава К.І., намеснікі дырэктара школы па выхаваўчай і вучэбнай рабоце, выйшлі на заслужаны адпачынак і пакінулі свае пасады, адпрацаваўшы ў якасці адміністратараў каля паўтара дзесятка гадоў.*

*На змену ім прыйшлі Чучва Г.І. (1985г.) і Усціновіч Г.В. (1987г.).*

*З 1984 года развярнулася інтэнсіўнае будаўніцтва ў калгасе "Кастрычнік", што пацягнула рост насельніцтва і напаўняльнасць школы. За 18 гадоў (1984-2002гг.) колькасць вучняў узрасла з* **156** *да* **412** *чалавек, г.зн. амаль у тры разы. За гэты час школа папоўнілася новымі педагогамі, сярод іх – Гудкова В.Я., Галіцкая І.І., Цярэнцьева С.В., Зінько В.В., Іадкоўскі Я.Ю., Кажанеўскі А.Я., Бузюк А.У., Коўган А.Г., Крэмко С.А., Новік Н.Ч., Піменава Н.У., Салашэнка В.У., Сурконт Р.Л., Шыкеля У.Я., Міхайлоўская Г.К., Зелянкоўская М.М., Сарока Н.Р., Пужук В.І., Шыкеля А.К.*

*Па розных прычынах са школы выбыла група настаўнікаў. Няма ўжо сярод жывых ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Кальцова У.М. і Мельнікава М.Г. пакінулі школу Князеў Б.А., Капля В.М., Лашук А.М., Калюта Н.Р., Флёрава І.Р., Маркевіч А.Г., Сасімовіч А.А., Скрабко І.Ч., Зарэцкая М.В., Стальмакова А.К.*

*Да 1993 года ў школе не было спартыўнай залы. У зімовы час урокі фізічнай культуры праводзіліся ў калідорах школы.*

*У 1994 годзе быў пабудаваны фізкультурна-аздараўленчы камплекс. У састаў комплексу ўваходзіць вялікая спартыўная зала, дзе пры неспрыяльным надвор'і могуць займацца адначасова некалькі класаў.*

*Школа з другой паловы 90-х гадоў стала працаваць у дзве змены. На 1 верасня 1999 года колькасць вучняў была 396 чалавек. Каб вырашыць гэтую праблему было распачата будаўніцтва новага крыла школы. Пасадзейнічаў будаўніцтву сам прэм'ер-міністр Навіцкі Г., які наведаў СГКП "Кастрычнік".*

*Значную фінансавую дапамогу ў будаўніцтве аказаў СГКП "Кастрычнік" на чале старшыні каўгаса* ***Крэмко Віталій Ільіч***



*І вось 2 верасня 2002 года адбылося ўрачыстае адкрыццё новай прыбудовы Квасоўскай СШ. На адкрыцці прысутнічалі: старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Саўчанка У.Я., старшыня СГКП "Кастрычнік" Крэмко В.І., старшыня абласнога камітэта адукацыі Гаўрон І.А., старшыня "Гроднапрамбуд" Вагабаў А.І., дырэктары суседніх школ, бацькі.*



*Сімвалічна, што кіраванне Квасоўскай сярэдняй школай прыняў новы малады дырэктар –* ***Крэмко Святлана Анатольеўна***

## *2. ГІСТОРЫЯ КВАСОЎСКАЙ СШ (2003-2023 гг.)*

*З ліпеня 2002 года дырэктарам Квасоўскай СШ стала Крэмко С.А. Была ўведзена ў строй прыбудова школы, дзе размясціліся пачатковыя класы, сталовая, галерэя злучыла школу са спартыўнай залай. Быў распачаты рэмонт старога будынка школы, сталі больш функцыянальнымі прадметныя кабінеты, атрымаў асобнае памяшканне музей школы, зроблена азеляненне і добраўпарадкаванне прышкольнай тэрыторыі.*



**Крэмко Святлана Анатольеўна**

*У 2004 годзе быў адкрыты гімназічны клас.*

*У школу прыходзілі новыя настаўнікі:*

*- у 2002 годзе Рачыцкая І.- педагог-псіхолаг;*

*у 2003 годзе Бычак Л. А.- настаўніца фізікі, Шкарда В. І. – настаўніца пачатковых класаў, Суравец І.М. - настаўніца беларускай мовы і літаратуры, Валкоўская Т. С. - настаўніца англійскай мовы, Ашмяна І.У. – настаўніца абслугоўваючай працы, Скварка І. М.- настаўніца музыкі і спеваў;*

*- у 2004 годзе Імпяровіч Г. С.- настаўніца беларускай мовы і літаратуры, Стрэльчык Н. К. – педагог-псіхолаг, Цішчанкава А. С.- настаўніца матэматыкі і інфарматыкі, Кісялеўская Н. Г.- сацыяльны педагог, Каваленка А. В. – настаўнік геаграфіі, Шота М. І. - настаўніца пачатковых класаў;*

*- у 2005 годзе Матукевіч Г. Ч. – настаўніца выяўленчага мастацтва.*

*Паўлоўская М. В.- настаўніца біялогіі, Лемяноўскі Д. А.- настаўнік фізічнай культуры, Бык В.І. – настаўніца рускай мовы і літаратуры,*

*- у 2006 годзе Дзем'янчук Р.В. – педагог- арганізатар, Хрыптовіч В.Л - настаўніца англійскай мовы;.*

*- у 2008 годзе Сарока А.К.- настаўніца рускай мовы і літаратуры, Бык А. Т. – настаўнік фізічнай культуры, Кадач Т. А. – настаўніца пачатковых класаў, Крыніцкі Э.Э – настаўнік фізікі, Катаева Л. В. - настаўніца беларускай мовы і літаратуры, Жукоўская Г. Т.- настаўніца музыкі і спеваў;*

*- у 2009 годзе Какора А.В.- педагог- арганізатар. Кунцэвіч А.І. - настаўніца матэматыкі, Сямашка А. Ф. – настаўнік фізікі, Дземша А. М. - настаўнік англійскай мовы;*

*- у 2011 годзе Аношка Г. І.- настаўнік матэматыкі і інфарматыкі, Лазавіцкая К. Л. – настаўніца біялогіі, Зубань А.М. - настаўнік музыкі і спеваў, Новік Ю.Ч.- настаўнік-дэфектолаг;*

*- у 2012 годзе Глушкевіч Т. М.- педагог-псіхолаг. Абрамук А.А.- настаўніца біялогіі, Лісоўская М.С.- настаўніца абслугоўваючай працы;*

*- у 2014 годзе Созінава М. С. – настаўніца біялогіі.*

*Трэба адзначыць, што Піменава Н. У., Скрабко І. Ч., Суравец І.М.. Скварка І. М., Імпяровіч Г. С., Шота М. І., Сарока А.К., Бык А. Т., Какора А. В., Дземша А.М. Созінава М.С. – выпускнікі Квасоўскай СШ.*

*У 2003 годзе на пенсію выйшла Ярашэвіч Л.І., у 2004 годзе Усціновіч Г.В., Бузюк А.У., у 2005 годзе - Эйсмант Р.С., Дзюрдзь К.І., Скварка К.Б., у 2013 годзе Чучва Г.І.*

*З 2006 года дырэктарам Квасоўскай СШ стаў* ***Хрыптовіч Алег Калікставіч.***

*З 2004 года па 2012 год намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце была Цярэнцьева С.В., з 2013 года па сённяшні час* ***Зубань А.М.***

*У 2012 годзе па 2014 год завучам па навучальнай рабоце была Шыкеля А.К., з 2014 года па сённяшні час* ***Турэвіч М.І.***

***Хрыптовіч Алег Калікставіч***



***Турэвіч Марыя Іосіфаўна***



***Зубань Аляксей Мікалаевіч***



*У 2010 годзе Алег Калікставіч Хрыптовіч быў прызнаны “Лепшым кіраўнікам сістэмы адукацыі Гродзенскай вобласці”, у 2017 годзе ўзнагароджаны Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, у 2020 – Ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, у 2021г. - Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

*У 2011 годзе настаўніца пачатковых класаў Турэвіч М.І. удзельнічала ў раённым этапе конкурса “Настаўнік года”. Па выніках 2014-2015 навучальнага года школа заняла першае месца ў раённым рэйтынгу.*

*У 2016 годзе закладзена алея выпускнікоў.*

*У 2018 годзе закладзены яблыневы сад.*

*У 2023 годзе настаўніца беларускай мовы і літаратуры Рахунок М. Г. удзельнічала ў раённым этапе конкурса “Настаўнік года”, у якім заняла другое месца.*







## 3. КВАСОЎСКАЯ СШ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ 1941-1945 гг.

*22 чэрвеня 1941 года раніцай жыхары вескі Квасоўка прачнуліся ад гучных гукаў самалётаў, якія ляцелі вельмі нізка і бомбавых удараў. У час бамбежкі была вельмі пашкоджана цэнтральная частка вёскі.*



*25 чэрвеня немцы акупіравалі Квасоўку і іншыя навакольныя вёскі. У будынку школы была размешчана нямецкая камендатура. Зрэдку тайна ў Квасоўку прыходзілі партызаны, распытвалі пра немцаў. Час быў цяжкі, людзі галадалі, баяліся. Усіх, хто аказваў дапамогу партызанам, немцы адразу вялі на растрэл.*

*Да гэтуль жыхары знаходзяць артэфакты з тых часоў, якія можна ўбачыць пры наведванні гісторыка-краязнаўчага музея Квасаўскай СШ.*








## *4. ГІСТОРЫЯ БУДЫНКА КВАСОЎСКАЙ СШ*



*Першы будынак школы ў Квасоўцы быў пабудаваны ў 1925 годзе і прадстаўляў сабой драўляны будынак. У ім і была адкрыта пачатковая школа з польскай мовай навучання.*

*У наступныя гады была адкрыта чатырохгадовая школа, у якой працавалі чатыры настаўнікі.*

*У 1938 годзе драўляны будынак школы згарэў. Быў пабудаваны новы цагляны будынак.У 1941 годзе вёска падверглася бамбардзіроўцы і 2 бомбы папалі ў школьны будынак. Аднак будынак не быў разбураны цалкам, фрагменты аднаго са снарадаў захоўваліся ў падвальным памяшканні школы да 80х гадоў.*



*У 1946 годзе ў весцы Лікоўка (1 км ад Квасоўкі) адкрываецца пачатковая школа, у якой налічвалася* ***65*** *чалавек. У 1947 годзе школа з вескі Лікоўка пераводзіцца ў Квасоўку ў адрамантаваны будынак, які быў часткова разбураны ў гады Вялікай айчыннай вайны.*

*Дырэктар школы стаў* ***Коратцаў Фёдар Афанасьевіч*** *заказаў дакументацыю на прыбудоўку школы, з 1968 года пачалося будаўніцтва прыбудовы на 18 класных памяшканняў, якое было скончана ў 1970 годзе ўжо пры новым дырэктары школы* ***Кавальчуку Іване Васільевічы****.*

*У 1969 годзе пачалося будаўніцтва школьнага стадыёна.*



У 1983 годзе быў пабудаваны фізкультурна-аздараўленчы комплекс. У склад комплексу ўваходзіць вялікая спартыўная зала, дзе пры неспрыяльным надвор'і могуць займацца адначасова некалькі класаў.





2 верасня 2002 года адбылося ўрачыстае адкрыццё новай прыбудовы Квасоўскай СШ





*У 2013 годдзе адбыўся капітальны рамонт фізкультурна-аздараўленчага комплекса. Адчыніла дзверы трэнажорная зала*









### *5. КІРАЎНІКІ КВАСОЎСКАЙ СШ (ДЫРЭКТАРЫ ШКОЛЫ) З 1925 г. І ПА НАШЫ ДНІ*

***1925 год – п****ершы дырэктар школы* **-** ***<u>Бабіцкая Алена</u>***
*1931 год – дырэктар школы* ***<u>Фанкоўскі Франц</u>***
*1934 год – дырэктар школы* ***<u>Фарад Мечыслаў</u>***
*1939 год* **–** *дырэктар школы* ***<u>Кішкель І.Ф.</u>***
*1951 год – дырэктар школы* ***<u>Смірнова Марыя</u>***
*1957 год* **–** *дырэктар школы* ***<u>Маскоўскіх Пётр Сяргеевіч</u>***
*1962 год* **–** *дырэктар школы* ***<u>Вяржбіцкі Франц Ігнацьевіч</u>***
*1966 год – дырэктар школы* ***<u>Каротцаў Фёдар Афанасьевіч</u>***
*1970 год – дырэктар школы* ***<u>Кавальчук Іван Васільевіч</u>***
*2002 год – дырэктар школы* ***<u>Крэмко Святлана Анатольеўна</u>***
*З 2006 года і па цяперашні час – дырэктар школы* ***<u>Хрыптовіч Алег Калікставіч</u>***



***Вяржбіцкі Ф.І.***



***Каротцаў Ф.А.***



***Кавальчук І.В.***



***Крэмко С.А.***



***Хрыптовіч А.К.***

## *6. НАСТАЎНІКІ КВАСОЎСКАЙ СШ, АДЗНАЧАНЫЯ ВЫСОКІМІ ЎЗНАГАРОДАМІ*

- ***Кавальчук Іван Васільевіч*** *— выдатнік народнай асветы БССР;*
- ***Бузюк Аляксандр Уладзіміравіч*** *— выдатнік народнай асветы БССР;*
- ***Кавальчук Надзея Фёдараўна*** *— Грамата МА БССР;*
- ***Дзюрдзь Казімір Іванавіч*** *— Грамата МА БССР;*
- ***Чучва Ганна Іосіфаўна*** *— Грамата абласнога ўпраўлення адукацыі, грамата гродзенскага абласнога выканкама, грамата МА РБ 2010;*
- ***Ціткова Марыя Іванаўна*** *— Грамата МА БССР;*
- ***Усціновіч Галіна Вячаславаўна*** *— Грамата МА БССР, пісьмо-падзяка абласнога ўпраўлення;*
- ***Мельнікава Кацярына Ігнацьеўна*** *— Грамата МА БССР;*
- ***Ярашэвіч Лідзія Ільінічна*** *— Грамата МА БССР.*
- ***Шота Ганна Зігмундаўна*** *— Грамата абласнога ўпраўлення адукацыі;*
- ***Гудкова Валянціна Ягораўна*** *- Грамата ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама 2014 г.;*
- ***Хрыптовіч Вольга Лявонцьеўна*** *- Грамата ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама 2016 г.; Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 2018 г.;*
- ***Сурконт Рамуальда Леанідаўна -*** *Ганаровая грамата ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама 2009 г.; Ганаровая грамата ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама 2017 г., Ганаровая грамата ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама 2019 г.; Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 2021 г.;*
- ***Шыкеля Уладзімір Якаўлевіч -*** *Грамата ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама 2010 г.;*
- ***Хрыптовіч Алег Калікставіч*** *- Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 2017 г., Ганаровая Грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 2020 г., Ганаровая Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 2021 г.*

## 7. СЯМЕЙНЫЯ ДЫНАСТЫІ КВАСОЎСКАЙ СШ

*Педагагічная работа – гэта пастаянная творчасць, вялікая душэўная шчодрасць, любоў да дзяцей і бязмежная адданасць сваёй справе. У школе нашага аграгарадка працавалі і працуюць дынастыі педагогаў, якія прысвяцілі свае жыццё дзіцячаму выхаванню і адукацыі. «Чаму людзі з пакалення ў пакаленне выбіралі і выбіраюць гэтую прафесію, ведаючы пра ўсе цяжкасці працы? Што рухае людзьмі пры выбары: асаблівы дар вучыць, цікавасць, імкненне да самарэалізацыі, генетычная схільнасць, парады старэйшых ці нешта іншае? Захаваць памяць пра настаўніцкія дынастыі - мэта нашай працы.*

### Сям'я СКВАРКО

*"Чалавек працай слаўны" – гэта народная мудрасць вядома ўсім. Вялікая павага да тых людзей, якія змаглі прывіць любоў да сваёй прафесіі дзецям. Такім чалавекам і з'яўляецца ветэран педагагічнай працы, настаўнік хіміі – Скварко (Маслоўская) Кацярына Браніславаўна.*

*Нарадзілася Кацярына Браніславаўна ў Мядзельскім раёне Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пад час вучобы ў школе, ёй падабаўся прадмет - хімія. У школе вучылася вельмі добра, была стараннай, адказнай вучаніцай. Ёй цікава было на ўроках, якія праводзіла настаўніца Гоман Алена Фёдараўна. У 1963 годзе Кацярыны Браніславаўна паступіла ў Віцебскі педагагічны інстытут імя Кірава на хіміка-біялагічны факультэт. У 1968 годзе скончыла і па размеркаванню прыехала працаваць у Квасоўскую сярэднюю школу настаўнікам хіміі. Гэтай прафесіі яна прысвяціла 37 гадоў. Сваім дзецям з любоўю расказвала, паказвала прыкладам, якая цікавая прафесія настаўніка.*



*Па стапам маці пайшлі і дзве дачкі: Зелянкоўская Марына Мечыславаўна і Сяцкевіч Іна Мечыславаўна. Старэйшая дачка - Марына Мечыславаўна скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Танка і з 1994 года працуе ў ДУА "Квасоўская сярэдняя школа" настаўніцай пачатковых класаў. Малодшая дачка – Іна Мечыславаўна ў 1998 годзе скончыла*

*Гродзенскае музыкальна-педагагічнае вучылішча (Гуманітарны каледж) па спецыяльнасці “Музычнае выхаванне” і працавала настаўнікам музыкі ў ДУА “Індурская сярэдняя школа”. У 2002 годзе была пераведзена ў ДУА “Квасоўская сярэдняя школа” на пасаду настаўніка музыкі. У 2015 годзе скончыла Гродзенскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Я. Купалы па спецыяльнасці “Дашкольнае выхаванне” і працуе выхавацелем у ДУА “Дзіцячы сад аг. Квасоўка”*

***Сям'я ШОТА***



*Шота (Бык) Ганна Зігмундаўна, нарадзілася ў 1959 годзе ў звычайнай сялянскай сям'і. У сям'і было трое дзяцей, усе дзяўчынкі. Вельмі любілі гуляць «у школу», дзе роля настаўніцы даставалася часцей старэйшай сястры.*

*Калі прыйшла пара выбіраць прафесію, Ганна Зігмундаўна, была ўпэўнена, што хоча быць настаўніцай, трэба было толькі выбраць паміж матэматыкай і хіміяй. Перамагла матэматыка, бо можна было вучыцца ў г. Гродна, а не ў другім горадзе. Выдатніцай ў школе Ганна Зігмундаўна не была, таму трохі баялася здаваць ўступныя экзамены (у той час на матфак быў конкурс 3-4 чалавека на месца). У жніўні 1976 год Ганна Зігмундаўна – судэнтка Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я Купалы. У чэрвені 1980 года яна атрымала дыплом па спецыяльнасці «настаўнік матэматыкі». У верасні 1980 года вярнулася ў сваю родную Квасоўскую школу і засталася тут назаўсёды. Выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей.*

*Яе дачка, Турэвіч (Шота) Марыя Іосіфаўна, у 1999 годзе паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы на настаўніцу пачатковых класаў. Так у іх сям'і з'явілася яшчэ адна настаўніца. Марыя скончыла ўніверсітэт у 2004 годзе і таксама вярнулася ў Квасоўскую СШ. Цярпер яны працуюць разам у роднай Квасоўскай школе.*

*Гады бягуць… У Квасоўскай школе Ганна Зігмундаўна працуе 43 год настаўніцай матэматыкі, яе дачка, Марыя Іосіфаўна – намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ўжо 8 гадоў, а ўвесь стаж работы 18.*

# *8. СЯМЕЙНЫЯ ПАРЫ КВАСОЎСКАЙ СШ*

*У любой прафесіі важныя традыцыі, пераемнасць прафесійных якасцей, сувязь паміж пакаленнямі. Лепш за ўсё яны рэалізуюцца тады, калі тая ці іншая справа становіцца часткай жыцця сям'і. Так утвараюцца настаўніцкія сямейныя пары..*

*Мы ганарымся сямейнымі парамі настаўнікаў нашай школы, ганарымся тым, што іх колькасць з кожным годам расце, а ўклад кожнага з іх у фарміраванне будучага спецыяліста неацэнны!*

## *Сям'я Нікіціных*





*Загадам №70 ад 20.08.1957 года на працу ў Квасоўскую школу былі залічаны Нікіцін Яўгеній Мікалаевіч настаўнікам фізікі і Нікіціна Ніна Міронаўна настаўніцай замежнай мовы. Ніна Міронаўна (Галісевіч) нарадзілася ў 1926 годзе ў вёсцы Маргі (Агароднікі) Квасоўскага сельсавета і пасля заканчэння інстытута вярнулася ў сваю родную школу, у якой разам са сваім мужам працавалі да выхаду на заслужаны адпачынак.*

## *Сям'я Мельнікавых*




*Мельнікаў Міхаіл Герасімавіч і Мельнікава Кацярына Ігнацьеўна прыехалі на работу ў нашу школу ў 1954 годзе як настаўнікі матэматыкі. З 1962 года, Міхаіл Герасімавіч, працаваў настаўнікам фізічнай культуры і пачатковай ваеннай падрыхтоўкі.*

*Кацярына Ігнацьеўна, стаўшы намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце, працягвала вучыць дзяцей матэматыцы. Іх дачка Таццяна таксама звязала сваё жыццё з выкладчыцкай дзейнасцю, працуючы выкладчыкам тэхнікума ў горадзе Палярныя Зоры ў Расіі.Мельнікавы больш не мянялі месца сваёй працы аж да выхаду на пенсію.*

## *Сям'я Кавальчук*




*У 1968 годзе атрымала прыказ на працу ў Квасоўскую сярэднюю школу сям'я Кавальчук.*

*Кавальчук Іван Васільевіч, 1940 г.н., у 1967 годзе скончыў БДУ, філалагічны факультэт, беларускае аддзяленне. З 1968 года 2002 год працаваў дырэктарам школы і выкладаў беларускую мову і літаратуру. Быў узнагароджанны званнем "Выдатнік народнай асветы БССР".*

*Яго жонка – Кавальчук Надзея Фёдараўна, 1936 г.н., у 1954 г скончыла Мсціслаўскае педвучылішча. У Квасоўскай сярэдняй школе працавала настаўніцай пачатковых класаў. Выдатная настаўніца: добрая, уважлівая да дзяцей, у меру строгая. Пра яе заўсёды ўспамінаюць з цеплынёй і павагай.*

## *Сям'я Бузюк – Усціновіч*




*Бузюк Аляксандр Уладзіміравіч нарадзіўся 6 студзеня 1941 года ў вёсцы Рэцямля Навагрудскага раёна. У 1964 годзе паступіў у Мінскі педагагічны інстытут на гістарычны факультэт. Па заканчэнні вучобы ў інстытуце працаваў у Мінскім абкаме камсамола.*

*У 1980 годзе атрымаў узнагароду "Выдатнік народнай асветы БССР". У гэтым жа годзе прапанавалі пасаду дырэктара Дзітрыкаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна. Пасля Чарнобыльскай катастрофы выпаў радыяцыйны дождж і сям'я пацярпела ад радыяцыі. Лячыліся ў шпіталі ўсёй сям'ёй . І ўрачы парэкамендавалі пераехаць у Гродна.*

*Так у 1987 годзе пераехалі сям'ёй у Квасоўку. З 1987 па 1999 год працаваў настаўнікам геаграфіі і гісторыі ў Квасоўскай сярэдняй школе. Зараз знаходзіцца на заслужаным адпачынку.*

*Усціновіч Галіна Вячаславаўна нарадзілася 27 верасня 1947 года ў вёсцы Ашмянцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Галіна Вячаславаўна стала педагогам, прысвяціўшы сваё жыццё навучанню і выхаванню дзяцей. У 1975 годзе скончыла Гродзенскі педінстытут імя Янкі Купалы па спецыяльнасці “Выкладчык рускай мовы і літаратуры”.*

*З 1987 года (у сувязі з пераездам сям'і) па 2004 год, да зыходу на пенсію, працавала ў Квасоўскай сярэдняй школе Гродзенскага раёна: настаўнікам рускай мовы і літаратуры, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай работы, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце.*

*За добрасумленную працу адзначалася Граматамі райвыканкама, аблвыканкама, Міністэрства асветы БССР, была занесена на раённую Дошку гонару. Неаднаразова адзначалася Граматамі райкама, абкама ЛКСМБ, Рэспубліканскага Савета піянерскай арганізацыі, Цэнтральным саветам Усесаюзнай піянерскай арганізацыі ўзнагароджана значком «За актыўную працу з піянерамі».*

## *Сям’я Шыкелі*





*Шыкеля Уладзімір Якаўлевіч, нарадзіўся 16 мая 1964 года. З 1985 па 1989 год вучыўся ў БГПУ імя А.С. Пушкіна на факультэце фізічнай культуры. Сваю педагагічную дзейнасць пачаў у Крытышынскай сярэдняй школе Брэсцкай вобласці. У 1993 годзе разам з жонкай і дзецьмі прыехалі ў в. Баранава. І з 1993 годзе працуе настаўнікам фізічнай культуры і здароўя ў ДУА “Квасоўская СШ”. Так склаўся лёс, што яго жонка таксама настаўніца.*

*Шыкеля Алена Канстанцінаўна, 25.07.1968 г.н. З 1985 па 1990 год вучылася ў БГПУ імя А.С. Пушкіна на фізіка-матэматычным факультэце. Сваю педагагічную дзейнаць пачала разам з мужам у Крытышынскай сярэдняй школе Брэсцкай вобласці. Да 1995 года гадавала сваіх маленькіх сыноў. З 1995 года*

*працуе настаўнікам матэматыкі ў ДУА “Квасоўская сярэдняя школа”. З 2007 года па 2014 год працавала намеснікам дырэктара па навучальнай рабоце, але жаданне вучыць і практыкаваць сваю дзенасць перамаглі і з 2014 года па сённяшні дзень яна працуе настаўнікам матэматыкі. У сваёй працы яна імкнецца да таго, каб на кожным уроку дзіця перажывала радасць адкрыццяў, магло паверыць у свае сілы і магчымасці, не баіцца навізны, увесь час знаходзіцца ў творчым пошуку, гледзячы на яе, вучні таксама імкнуцца пазнаць шмат новага і цікавага. Яна вучыць іх, а яны вучаць яе.*

### *Сям’я Хрыптовіч*





*Хрыптовіч Алег Калікставіч нарадзіўся 21 ліпеня 1976 года ў в. Васілішкі, Шчучынскага раена. Скончыў у 1998 годзе ўстанову адукацыі Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы па спецыяльнасці “ Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю “Замежная мова (англійская)". У 2009 г. скончыў факультэт перападрыхтоўкі пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце ім. Я. Купалы па спецыяльнасці " Менеджар сістэмы дашкольнага, агульнага сярэдняга і пазашкольнага навучання і выхавання» Займаемая пасада: дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі “Квасоўская сярэдняя школа".*

*З 10.01.2006 працуе настаўнікам англійскай мовы Квасоўскай агульнаадукацыйнай сярэдняй школы. З 06.03.2006 г. - дырэктарам гэтай жа школы. Хрыптовіч А.К. – вопытны кіраўнік з высокім пачуццём адказнасці, актыўна праяўляе сябе ва ўсіх напрамках адукацыйнага працэсу, з'яўляецца ініцыятарам новаўвядзенняў у школе, накіраваных на павышэнне якасці адукацыі. За перыяд работы ў Квасоўскай СШ узнагароджаны Граматай*

*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.*

*Хрыптовіч Вольга Лявонцьеўна, нарадзілася 12 верасня 1976 г. у г. Гродна. З 1982 па 1989 г. вучылася ў СШ№25 г. Гродна, затым у гімназіі №30, якую скончыла ў 1993 г. з залатым медалём. З 1993 па 1998 г. з'яўлялася студэнткай гістарычнага факультэта (спецыяльнасць—Гісторыя і замежная мова (французская) Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Я. Купалы паралельна працавала настаўнікам французскай мовы на няпоўную нагрузку (94-95, 95-96 нав. гады, студз.98-май 98) у СШ№25 г.Гродна. Па заканчэнні ўніверсітэта атрымала размеркаванне ў СШ№ 25 г. Гродна, дзе прапрацавала з 1998 па 2008 гг. спачатку настаўнікам французскай мовы, Затым французскай і англійскай мовы, т. як. у 2001 годзе атрымала дыплом Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Я. Купалы аб перападрыхтоўцы па спецыяльнасці “англійская мова”.*

*З 1 верасня 2006 г. з'яўляецца настаўнікам англійскай мовы ўстановы адукацыі Квасоўская СШ (афармлена пераводам) у сувязі з пераводам мужа на пасаду дырэктара школы ў аг. Квасоўка. За высокія дасягненні і плённую працу ўзнагароджана Граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*



## *9. ВЫПУСКНІКІ КВАСОЎСКАЙ СШ, ЯКІМІ МЫ МОЖАМ ГАНАРЫЦЦА*

### *Бык Станіслаў Пятровіч*



*С.П.Бык нарадзіўся ў вёсцы Квасоўка ў 1923 годзе. Скончыў Квасоўскую сямігадовую школу. Выхоўваўся разьбяр па дрэву і мастак ў сялянскай сям'і, у якой яшчэ акрамя яго было чацвёра дзяцей. З дзяцінства хлопчыка вабіла творчасць, ён ад прыроды добра маляваў, а потым стаў рабіць цацкі, свістулькі з дрэва. Так з'явілася жаданне перадаць свае пачуцці, думкі, назіранні з дапамогай пэндзля і разца. Фантазія біла ключом, а матэрыял для падзелак быў літаральна пад рукой: у лесе, у полі, ва ўласным двары. Так сталі з'яўляцца на свет мудрагелістыя кампазіцыі з дрэва… Малады Станіслаў стаў самадзейным мастаком і разьбяром па дрэву. Сям'я была небагатай, пагэтаму не магла сабе дазволіць вучыць Станіслава. У сталыя гады Станіслаў завочна вучыўся ў Маскоўскім мастацкім вучылішчы, дзе браў урокі жывапісу. У яго была магчымасць вучыцца ў Мінскім мастацкім вучылішчы, куды ён мог пайсці вучыцца без уступных экзаменаў, але Станіслаў Пятровіч не пажадаў развітацца са сваёй сям'ёй і роднай зямлёй. А яшчэ для вучобы патрэбны былі матэрыяльныя сродкі, якіх у цяжкія пасляваенныя гады не было. Самадзейнаму майстру не хапала ведаў па анатоміі, лепцы, кампазіцыйнай будове скульптур. Цэлы месяц Станіслаў Бык наведваў майстэрню народнага мастака А.Бэмбеля, ляпіў і маляваў. У кожную работу С.П.Бык укладваў часцінку душы … Работы майстра былі на тэму прыроды – "Зубры", "Алень"; працы на зямлі – "Пчаляр", "У полі", "Радасць сялянскай працы"; Вялікай Айчыннай вайне – "Салдат Перамогі". Асобай тэмай была рэлігійная: С.П.Бык з'яўляецца аўтарам скульптур у касцёле аграгарадка Квасоўка. Больш чым за 30 гадоў творчага шляху, майстар выразаў дзясяткі розных скульптур і*

*рэльефаў.Так Станіслаў Пятровіч і не атрымаў прафесійнай адукацыі, але стаў самадзейным народным майстрам. 1949 года ў жыцці С.П. Быка адбылася важная падзея: ён ажаніўся з Уладзіславай Аляксандраўнай Шкутай, якая таксама была з вёскі Квасоўка. У 1951 годзе ў іх нарадзіўся сын Казімір (цяпер працуе хірургам у дзіцячай бальніцы ў горадзе Гродна). Месцам працы С.П.Быка лічылася Гродзенская фабрыка мастацкіх вырабаў, там ён працаваў 35 гадоў, адтуль ён і пайшоў на пенсію. Дарэчы кажучы, таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. У С. П. Быка быў яшчэ адзін талент: ён добра спяваў. Доўгі час з 1965 года ён наведваў Квасоўскі народны хор пры Доме культуры.*

*У апошнія гады жыцця здароўе стала пагаршацца, гады давалі сваё. Але і тады майстра не развітваўся з любімай справай, увесь час прападаў у сваёй майстэрні, заўсёды знаходзіўся ў мастацкім пошуку. Як казаў С. П. Бык: "Ад работы атрымліваеш няведаную асалоду, якая дапамагае жыць." Памёр С. П. Бык 28 чэрвеня 2008 года. Пахаваны на могілках у Квасоўцы.*

***Работы С.П. Быка***









**_Сяргей Вітальевіч Крэмко_**



*Сяргей Вітальевіч Крэмко нарадзіўся 21.01.1970 года ў в.Верцялішкі Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1987 годзе скончыў Квасоўскую сярэднюю школу.*

*Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1987 годзе слесарам калгаса "Кастрычнік" Гродзенскага раёна. З 1987 па 1992 год вучыўся ў Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце. З 1988 па 1989 год служыў у радах узброеных сіл СССР. З 1993 года па 1994 год працаваў аграномам-аграхімікам у сельскагаспадарчым калектыўным прадпрыемстве "Кастрычнік" Гродзенскага раёна. З 1994 года па 2001 год - галоўны аграном сельскагаспадарчага калектыўнага прадпрыемства "Кастрычнік" Гродзенскага раёна. З 2001 года па 2004 год - намеснік старшыні цэха раслінаводства сельскагаспадарчага калектыўнага прадпрыемства "Кастрычнік - Гродна" Гродзенскага раёна. З 2004 года па 2007 год - намеснік старшыні сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва "Кастрычнік - Гродна" Гродзенскага раёна. З 2007 года - старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва "Кастрычнік-Гродна" Гродзенскага раёна, які ў лістападзе 2010 года перайменаваны ў Калгас імя У.І.Крамко, а ў красавіку 2017 года - вытворчы кааператыў імя У.І.Крэмко.*

*Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву Сяргея Вітальевіча Крэмко, кааператыў неаднаразова з'яўляўся пераможцам розных спаборніцтваў раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў. У 2008, 2009, 2011 і 2017 гадах быў занесены на Рэспубліканскую дошку Гонару.*

*Крэмко С. В. узнагароджаны Ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2008 год), Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта (2011,2019 г.г.), Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2017 год), медалём "За працоўныя заслугі" (2006 год). ), Ордэнам Беларускай Праваслаўнай Царквы. З'яўляецца лаўрэатам прэміі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта "Чалавек года Гродзеншчыны" (2013 год).*

*На падставе Палажэння аб парадку прысваення звання "Ганаровы грамадзянін Гродзенскага раёна", рашэннем Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў ад 14 чэрвеня 2019 года Крэмко Сяргею Вітальевічу прысвоена званне "Ганаровы грамадзянін Гродзенскага раёна".*

*У 2022 годзе С.В. Крэмко ўзнагароджаны нагрудным знакам адзнакі “За заслугі ў сельскай гаспадарцы” і Ордэнам Айчыны III ступені.*






***Біркас Аляксандр Адамавіч***



*Нарадзіўся 21.07.1935, в. Дарошавічы, Гродзенскі раён, Гродзенская вобласць. Урач-хірург, арганізатар аховы здароўя. Кандыдат медыцынскіх навук (1972), прафесар (1993).*

***Адукацыя:***

*У 1951 годзе адбыўся першы выпуск Квасоўскай сямігодкі. Сярод выпускнікоў быў і Аляксандр Біркос.*

*Гродзенскае медыцынскае вучылішча (1956), Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (1965).*

*Навуковыя інтарэсы: хірургія селязёнкі; медыка-сацыяльныя аспекты гарадской сям'і; якасць амбулаторна-паліклінічнай і стацыянарнай дапамогі; якасць працы сярэдняга медыцынскага персаналу.*

*Месца працы, пасада: Дабравольская ўчастковая бальніца (Свіслацкі раён; 1956, фельчар), Багушэўскі фельчарска-акушэрскі пункт (Шчучынскі раён; 1957-1958, загадчык), станцыя хуткай медыцынскай дапамогі Гродзенскага раёна (1958-1959, фельчар), Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (1965-1969 – асістэнт кафедры аператыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі, 1969-1976 – кафедры факультэцкай хірургіі, 1976-1987 – дацэнт кафедры шпітальнай хірургіі, 1987-2003 – прафесар кафедры грамадскага здароўя і аховы здароўя, у 1987-2003 – загадчык кафедры, 2003-2007 – кіраўнік аддзела практыкі).*

*У 2020 годзе прыязджаў у Квасоўку і прымаў удзел у святкаванні 95-годдзя школы.*

## *Шкута Любоў Міронаўна*

*Шкута Любоў Міронаўна нарадзілася ў 1940 г. у в. Дарошавічы Гродзенскага раёна. У 1976 г. скончыла Ваўкавыскі зоаветэрынарны тэхнікум. З 1965 года працавала даяркай на малочна-таварнай ферме ў в. Дарошавічы.*

*Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1975-1980 гг.*

*Узнагароджана ордэнамі Леніна (1985г.), Працоўнага Чырвонага Сцяга, “Знак Пашаны”, залатым медалём ВДНГ СССР.*



МАСТЕР МАШИННОГО ДОЕНИЯ

доярка колхоза «Октябрь», депутат Верховного Совета БССР, кавалер ордена Трудового Красного Знамени **Любовь Мироновна Шкута.**

Основа ее успехов—мастерство и высокий научно-технический уровень работы



***Ліс Павел Анатольевіч***

*Вучыўся ў Квасоўскай СШ з 1990 па 1997 гады.*

*Генеральны дырэктар кампаніі “Авектыст", якая з'яўляецца вядучым сістэмным інтэгратарам Беларусі ў сферы інфарматызацыі і аўтаматызацыі кіравання, бяспекі, жыццезабеспячэння тэхналагічных і інфраструктурных аб'ектаў.*

https://clck.ru/33kvUv

*2017-2019 дырэктар ГИАЦ Мінадукацыі.*

*"ЖЫЦЦЁ НА ДВАЙНЫ ХУТКАСЦІ"» Адзін дзень з Паўлам Лісам-інтэрв'ю OFFICE LIFE ад 15 лютага 2021* https://clck.ru/33kvVm

*“У адкрытым доступе” з Аляксандрам Сярэбранікавым " #41 / Электронная Беларусь ад 11 чэрвеня 2022 г.*

https://clck.ru/33kveE

*Яго артыкулы:* https://clck.ru/33kviV

**Цярэнцьеў Ілля Сяргеевіч**



*Нарадзіўся 25.01.1995г. у вёсцы Баранава Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці.*

*З 2001 па 2008г. – вучыўся ў Квасоўскай СШ. У 2012 г. скончыў УА "Рэспубліканскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву" г. Мінска.*

*З 2008 па 2018 г. г.быў вучнем Сяргея Мікалаевіча Летвінава – алімпійскага чэмпіёна па кіданні молата 1988 г., двухразовага чэмпіёна свету (1983,1987), эксрэкардсмена.*

*Цярэнцьеў І. С. з'яўляецца чэмпіёнам свету па лёгкай атлетыцы (кіданне молата) сярод юніёраў 2014 г. (3 месца).*

***Дасягненні:***




*2011г. - Чэмпіянат Расіі сярод юніёраў - 3 месца.*

*2012г. - Чэмпіянат Расіі сярод юніёраў - 1 месца.*

*2013г. - Чэмпіянат Расіі сярод юніёраў - 1 месца.*

*2014г. - Чэмпіянат свету сярод юніёраў - 3 месца.*

*2015г. - Чэмпіянат Расіі-4 месца.*
*2016г. - Чэмпіянат Расіі - 2 месца.*
*2017г. - Чэмпіянат Расіі - 2 месца.*
*2018г. - Чэмпіянат Расіі - 6 месца.*
*2021г. - Чэмпіянат Расіі - 3 месца.*
*2022 г. - Чэмпіянат Расіі - 3 месца .*
*Асабісты рэкорд: 7 кг-75.38; 6 кг. - 79.36 (у 20 гадоў, 2014г.)*

*З 2018 года працуе фітнэстрэнерам анлайн, дапамагаючы навучэнцам зніжаць вагу і набіраць мышачную масу. У дадзены момант уваходзіць у склад зборнай Расіі па лёгкай атлетыцы і рыхтуецца да спаборніцтваў.*

***Блажукевіч Віктар Часлававіч***



*Скончыў Квасоўскую сярэднюю школу ў 1980 годзе. Выпускнік кафедры "Транспартныя Сістэмы і тэхналогіі" БНТУ г. Мінска.*

*З'яўляецца заснавальнікам дзвюх арганізацый (2012 г.), якія ажыццяўляюць паслугі аўтамабільнага грузавога транспарту па перавозках: ТАА "Траско", ТАА "Алев-Транс".*

*Сёння з'яўляецца генеральным дырэктарам СТАА “M&M Мілітцэр & Мюнх".*

*З 2021 года ўваходзіць у склад членаў Рэвізійнай камісіі Асацыяцыі «БАМАП»- Асацыяцыя міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў, якая ўваходзіць у склад Міжнароднага саюза аўтамабільнага транспарту (МСАТ, Швейцарыя).*

***Васілеўская Алена Казіміраўна***



*Васілеўская Алена Казіміраўна, начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта*

*Васілеўская (Сарока) Алена Казіміраўна, нарадзілася 28 студзеня 1986 года ў вёсцы Квасоўка. У 2001 скончыла 9 класаў Квасоўскай сярэдняй школы і паступіла вучыцца ў ліцэй №1 г. Гродна, які скончыла з залатым медалем у 2003 годзе. У 2008 годзе з чырвоным дыпломам скончыла ўстанову адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», па спецыяльнасці «Руская філалогія» са спецыялізацыяй «Руская мова як замежная», з прысваеннем кваліфікацыі філолаг, выкладчык рускай мовы і літаратуры, выкладчык рускай мовы як замежнай. У 2018 годзе скончыла Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь факультэт падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і ідэалогія».*

*З 1 чэрвеня 2018 года па цяперашні час працуе начальнікам аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта.*

*Васілеўская А.К. узнагароджана Ганаровай граматай Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта (2014), Ганаровай граматай Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў (2017), Ганаровай граматай Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта (2017), Граматай праўлення Гродзенскай раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын» (2019, 2021), падзячным лістом Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа (2019), Ганаровай граматай грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын» (2021), Граматай Гродзенскага раённага Аб'яднання прафсаюзаў (2023), падзякай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2023).*

*У 2025 годдзе школа адзначыць свой юбілей – 100 гадоў з дня існавання. 100 год – важная дата. Але для школы, якая кожны дзень сустракае моладзь, гэта не ўзрост. Яшчэ многія гады будзе гучаць у гэтых сценах дзіцячы смех і клікаць на ўрок залівісты школьны званок.*

*Гісторыя школы працягваецца. І дапіша яе новае пакаленне…*



